ЗАРАВА

Цана 1000 м. п.

АДНАДНЕЎКА.

Вільня, Пятніца 25 трауня, 1923 году.

ПРАЦЭС БЕЛАРУСАЎ у БЕЛАСТОКУ

(Ад уласнага карэспандэнта).

Першы дзень.

У 11 гадз. 25 мін прадседацель Дыноўскі адчыняе паседжаньне.

Пачынаецца апрос падсудных, што цягнецца паўгадзіны.

Усе падсудныя дзеляцца на дьзве часткі: адны, знаходзяцца пад вартай і сядзяць асобна, іх 33 чалавекі, другія ў ліку 12 знаходзяцца на волі ў тым ліку абодва паслы Баран і Якавюк.

Спісак абаронцаў абвешчаны намі трэба папраніць: апрача Врублеўскага, Бабянскага, Міцкевіча, Грушкевіча, Славінскага, аб якіх мы ўжо пісалі, яшчэ Ражанскі, Обедзінзкі, Рэйнгард і Кланк.

Большасьць падсудных маладыя людзі, здаровага энэргічнага віду, шмат у каго, нягледзячы на доўгае прабываньне ў вастрозе, досыць добры выгляд. Толькі ў некаторых відаць моцная зморанасьць. Большасьць трымаецца бадзёрна і спакойна. Па сацыяльнаму палажэньню і прафэсіі абвінавачаныя: народныя вучыцелі, двох быўшых афіцэраў, адзін землямер, адзін фэльшар, рэшта—земляробы, работнікі і дробныя гандляры.

Агульную увагу зварочывае галоўная асоба працэсу Вера Маслоўская, разумная, энэргічная твар якой адпавядае тэй кіраўнічай ролі, якую яна, не адкідаючы выстаўленых проціў яе абвінавачаньняў, спакойна і проста прызнала за сабою ў свай сягодняшняй прамове ў адказ на пытаньні прадседацеля. Гэныя яе паказаньні і ёсьць галоўным мамэнтам першага дня працэсу.

На стале перад судом разложаны „рэчовыя доказы дакананых і маючых быць зробленымі праступленьняў“: каля дзесятка рэвальвэраў рожных сыстэмаў, а на падлозе — таксама больш дзесятка старых ржавых стрэльбаў з „складаў аружжа і амуніцыі“, аб якіх гаворыцца ў акце абвінавачаньня.

Кідаецца ў вочы гэтая нестасоўнасьць паміж вялізарным і грозным заданьнем „адарваньня ад Польшчы беларускіх тэрыторый і ўтварэньне з іх Незалежнай Беларускай Рэспублікі“ і гэтых срэдстваў зьдзейсьненьня заданьня.

Прадстаўленнага суду аружжа да дзіўнасьці мала для таго, каб паўстаньне можна было назваць *аружным*—настолькі, каб яно магло пагражаць Польскай Рэспубліцы. . . .

На стале і другія срэдствы барацьбы, знойдзеныя па словам акту абвінавачаньня пры вобыску ў тайнай штаб кватэры паўстанцаў у Белавежскай пушчы: бутэлька з цыяністым каліем (моцны яд) і стрыхнін. Есьць ручныя гранаты, піраксылінавыя шашкі і інш.

Пры спраўджаньні сьведкаў выявілася адсутнасьць такіх сьведкаў, якія зьяўляюцца надта важнымі для працэсу. У ліку іх усе тыя кіты, на працы у якіх пакоіцца ўся будова акту абвінавачаньня: гэта—капітан Д. О. К. 7 у Горадні—Ярэцкі, агент Горадзенскага Urzędu Śledczego Канст. Шыгаловіч, які ўвайшоў у арганізацыю для „унутраннага высьвятленьня“, Гэнрык Погожэльскі старшы пшодовнік Дзярж. Паліцыі ў Варшаве. Бракуе і шэраг меней важных сьведкаў.

З гэтай прычыны вынікае спрэчка паміж абаронай, якая дамагаецца адлажыць справу да вызаву сьведкаў, якія могуць быць вызваны безадкладна. Да гэтай заявы абаронцы Бабянскага далучаюцца ўсе абаронцы.

Пракурор лічыць, што прадстаўленныя *галоўнымі* з адсутных сьведкаў прычына неяўкі зьяўляюцца выстарчаючымі; бяз рэшты, меней важных, суд можа абысьціся, бо іх паказаньні ёсьць у матар'ялах папярэдняга следства.

Суд, выслухаўшы рэплікі старон, удаліўся на нараду і вынес рэзалюцыю—справу слуханьнем прадаўжаць, з тым, што сьведкі Яроцкі і Шыгаловіч будуць вызваны паўторна, а не зьявіўшыяся без выстарчаючых прычын будуць аштрафованы па 20.000 марак, сьведку Погожэльскага нягледзячы на яго службовае палажэньне суд не пастанавіў вызваць другі раз з прычыны *невядомасьці Суду яго местапрабываньня* (?!)

Пасьля начынаецца чытаньне акта абвінавачаньня, што займае ўвесь час да перарыва—да 4 гадз.

Акт абвінавачаньня, па прызнаньню нават шмат каго з абаронцаў, састаўлены пракурорам Ясінскім дужа ўдала. Гэта абшырная праца ў 60 старонак уборыстата друку на машынцы.

Галоўны зьмест яго гэткі:

У пачатку 1922 г. экспозытура 5 f. Pol. Pańśtw. напала на сьлед шырока раскінутай беларускай арганізацыі, маючай на мэце ўтварэньне пры дапамозе аружнага паўстаньня проціў Польшчы, Беларускай Незалежнай Народнай Рэспублікі. Рух гэты, моцна падтрымліваемы матэрыяльна і маральна праз Ковенскую Літву і часткова праз Нямеччыну, імкнуўся да ўтварэньня на тэрыторыі Ковенскай Літвы рэгулярных аддзелаў беларускіх войск, а на тэрыторыі Польшчы, заселянай беларусамі, значных партызанскіх аддзелаў.

Для гэтай мэты уся арганізацыя мела вайсковы характар і тэрытарыяльна была падзелена на 4 групы, кожная з якіх мела сваёго начальніка і штаб. Тэрыторыя кожнай групы дзяліліся далей на аддзелы, раёны, сэкцыі і „зьвеньня“, меўшыя сваіх начальнікаў, штабы, афіцэраў для лучнасьці, кур'ераў і партызанаў, вербаваўшыхся шляхам агітацыі сярод мясцовай беларускай люднасьці.

На чале ўсяго руху стаяў Цэнтральны Беларускі Камітэт у Коўне, прадстаўляемы так званай „групай Ластоўскага“ і называючы сябе „Урадам Незалежнай Беларускай Рэспублікі“.

Горадзеншчына ўваходзіла ў склад 4 групы, на чале якой стаяў атаман Хмара, запраўднае імя якога ёсьць Вячаслаў Разумовіч, паручнік Літоўскай арміі.

Местапрабываньнем Разумовіча і ягонага штабу было літоўскае мястэчка Мэрач на польскай граніцы. Аддуль пасылаліся Хмарай у Горадзеншчыну загады, адтуль прывозілася тайна аружжа для загаворшчыкаў, узрыўчатыя матэр'ялы і труцізна—цыяністы калій і стрыхнін, якія празначаліся для ўжытку проціў польскай арміі і паліцыі.

У Мэрач у штаб Хмары пастаянна езьдзілі загаворшчыкі за інфармацыямі, інструкцыямі, з дакладамі службовымі,—за аружжам і грашамі.

Далей акт абвінавачываньня зьвязываець дзейнасьць гэтых арганізацый з зьездам беларусаў у Празе восеняй 1921 г. На зьездзе, па славах акта, было пастаноўлена падняць аружнае паўстаньне супроць Польшчы. Тэрмін паўстаньня быў назначаны на пачатак сакавіка 1922 г., але пасьля раскрыцьця арганізацыі і масавых арыштаў беларусаў і учасьнікаў арганізацыі было перанесена на першую палову красавіка. На зьездзе ў Празе прымалі ўчасьце ад Горадзеншчыны В. Маслоўская народная вучыцелька і Сяргей Баранаў.

Маслоўская была галоўнай дзеячкай—агітатарам і арганізатарам паўстаньня ў Горадзеншчыне, а Баранаў, па даных II аддзелу Ген. Штабу, таксама адзін з галоўных дзеячоў паўстанчага руху—будучы прадседацелям Горадзенскага Белар. Нац. К-ту.

Больш падробныя інфармацыі даў жыхар мяст. Саколкі Эдуард Ленкевіч, які ўвашоў у арганізацыю з мэтай, на яго прызнаньню, раскрыцьця яе. Інфармацыі Ленкевіча былі повадам масавых арыштаў і пачатка следзтва па гэтай справе.

Ленкевіч паказаў, што ў пачатку сьнежня 1921 г. крамнік м. Саколка Гораш Александр запрапанаваў яму ўвайсьці у арганізацыю пазнаёміў з Маслоўскай, якая пачала з ім гутарку аб тым быццам палякі прыгнетаюць беларусаў і запрапанавала яму ўступіць у арганізацыю, якая мае на мэце скінуць польскую ўладу і вызваліць беларускі народ, пры гэтым абяцала даць яму мейсца начальніка Сакольскага павету і адпаведную заплату. Ленкевіч даў згоду і Маслоўская зьездзіўшы ў Мэрач (у Літве) у штаб IV групы прывязла яму назначэньне, дала 20.000 марак і ўручыла загад Хмары, у якім былі пералічны абавязкі начальніка павету.

Абавязкі гэтыя абмяжовываліся ў набіраньні маладых людзей ў фармуемую ў Літве беларускую армію, а ў сябе ў павеце партызанскіх атрадаў, зьбіраньні аружжа, у самай падробнай разьведцы адносна да ваенных сілаў Польшчы, аб яе ўнутраным палажэньні, ў агітацыі сярод сялян проці польскай улады, падстраканьнем недавольства насяленьня.

Затым Лянкевіч пакрыху ўваходзіў у справу бліжэй, атрымымаў ад Хмары загады і увайшоў у сувязь з шэрагам сяброў групы.

2—II—22 г. да Ленкевіча Гораш прывез Аўгеню Матэйчук, сястру Веры Маслоўскай, якая ўказала яму спосаб праезду ў Мэрач, куды ён быў вызваны, праз нейкага Козіча, Хмараю. Трэба было праехаць у Горадню, адтуль на станцыю Марцінканцы, затым пехатой у Дарывелі, дзе зьявіцца да Мацея Грыгаса, якому трэба сказаць, што зьявіўся ад імя сястры Веры. Тады Грыгас правядзе праз граніцу ў Літву. Лянкевіч паехаў ў Горадню, дзе ў беларускай школе ў вучыцеля Аляксандры Парука спаткаўся з Козічам і Карповічам. У апошняга, толькі што вярнуўшагася з Штабу з Мэрачы, было з сабою 3 маўзэры, 4 ручныя гранаты, пістоны для ўзрываньня міня, шапірограф.

У тую-ж ноч Ленкевіч паказанаю дарогаю прабраўся ў Мэрач да Хмары, у якога застаў яго начальніка штабу палк. Валошыча.

У наступны дзень у штабе адбылося сабраньне, на якім Хмара абрысаваў плян дзейнасьці—каб у рашучы момант падняць паўстаньне і зьвесьці са сьвету прадстаўнікоў польскай улады. Хмара запэўніў усіх прысутных, што Літва і Нямеччына падтрымаюць паўстаньне. Літва дасьць аружжа трэба толькі найсьці патаемныя месты дзеля яго захаваньня да патрэбнага мамэнту.

Уся арганізацыя, па Ленкевічу, дзялілася на 4 групы, штабы якіх знаходзіліся: 1) у Коўне (ёй падпарадкаваўся беларускі полк, які стаіць пад Коўнам), 2) у Уцянах, 3) у Аранах і 4) ў Мэрачы. Да апошняй групы і належалі паветы Горадзенскі, Беластоцкі, Сакольскі, Бельскі, Ваўкавыскі і Лідзкі.

Ленкевіч называе гэткіх загаворшчыкаў: Кастуся Матэйчука, брата Аўгені Матэйчук і Веры Маслоўскай, Адама Трыпузу, начальніка Горадзенскага павету, яго памоцніка Ал—ра Парука, беларускага вучыцеля ў Горадні, Кліманта Замойда, псаломшчыка ў Саколцы, Сьцяпана Жабінскага, начальніка Ваўкавыскага пав., Германа Шыманюка, які арганізаваў 12 партызанскіх атрадаў па 100 чэлавек у кожным (як далей пабачым гэтыя цыфры зусім фіктыўны); Грыгора Астравецкага, Андрэя Каляду і Сымона Якавюка з Горадні, быццам аднаго з галоўных загаворшчыкаў, які запэўняў у Коўні, што ў яго 30.000 партызанаў, на што атрымаў ад ураду Літвы 70.000 нямецкіх марак, за якія грошы Якавюк быццам купіў у Горадні два дамы, гандляра Гораша, які набіраў маладых хлапцоў у Літву, вазіў аружжа і грошы на агітацыю.

Сьведка Грыгор Міхнюк, увайшоўшы ў арганізацыю высьвятліў уладам працу другога выбітнага дзеяча арганізацыі паўстанцаў Аляксандра Станкевіча, расейскага камуністы, служыўшага ў чырвонай арміі ў конніцы Будзенага, дзе быў палкоўнікам, а пасьля вайны прыехаў у Польшчу і пасяліўся ў Крынках Горадзенскага павету. З'ездзіўшы у Літву да Хмары Станкевіч вярнуўся начальнікам асобнага аддзелу; прывёз адтуль аружжа і абяцаў атрымаць яшчэ 500 маўзэраў, два пуды дынаміту і людзей дзеля ўзрыву шэрагу будынкаў у Беластоку.

У характару рэчавых доказаў і дакумэнтаў Ленкевічам прадстаўлены загады па арганізацыі, шыфр знаходзячыся ў лемантару „Зорка“, якім карысталіся загаварщчыкі, сьпіскі служашчых у арганізацыі з вызначэньнем іх утрыманьня і г. д.

Загадам Хмары № 2 з мэтай лепшай канспірацыі заведзяна—каб усе аддзелы, раёны, сэкцыі насілі назовы як-то: коопэратывы, прасьветныя гурткі, царкоўныя брацтвы і інш. Усе сябры

арганізацыі мусяць насіць назовы „сяброў братства“.

З шыфрованых загадаў відаць, што начальнікамі павятовых штабаў былі: ў Горадні — Трыпуза (мянюшка Каласковы), ў Лідзкім пав. — Дрозд (Шпаковіч), у Бельскім пав. Шыманюк — Парыш (Скамарох), у Беластоцкім пав. Маслоўская (Мурашка), у Сакольскім пав. Ленкевіч (Сокал), у Ваўкавыскім пав. Жабінскі (Пчала). Усім ім загадывалася ў экстранным парадку зрабіць рэгістрацыю шофераў, авіатараў, электратэхнікаў і др. спэцыялістаў; а таксама рэгістрацыю аружжа агнястрэльнага, халоднага і ўзрыўчатых матэр'ялаў, бомбаў, гранатаў, пыраксыліны і інш.

У Гэрмана Шыманюка пры вобыску знойдзены сьпісак асоб, якія былі на службе і утрыманьні Хмары з 1 лютага 1922 г. з точным пералічэньнем функцый кожнага ў арганізацыі, іх імёны, прозьвішчы, мянюшкі, прафэсыі і адрасы. У сьпіску гэтым зьмешчаны такія асобы:

1) Захарчук Язэп (Еж)—начальнік сэкцыі Бельшчыны.

2) Карней Кіпрыянюк—капрал, тэлеграфіст начальнік сэкцыі ў Чыжыках.

3) Аляксей Тарасэвіч (Татарын).

4) Пётра Саўчук, нач. сэкцыі ў Малочках.

5) Марцін Лукашук (Шабуленка).

6) Кузьма Барташук (Яварук) нач. району.

7) Кірыла Барташук (Чайка) нач. району, матрос.

8) Іванюк Ефрэм (Лес) нач. сэкцыі.

9) Савасьцьян Смык, нач. сэкцыі.

10) Бушка Язэп (Гарлоў) нач. сэкцыі, землямер,

11) Васілюк Віктар (Тошна),

12) Валасэвіч Амельян (Доктар) нач. санітарнага атраду—фэльчар,

13) Кузьма Трафімюк (Крачкоў) афіцэр для лучнасьці,

14) Грыгор Каляда (Барысаў) афіцэр для лучнасьці, артылерыст.

У другіх сьпісках працаўнікоў арганізацыі, знойдзеных пры вобыску, фігуруюць яшчэ: Зьмітрук Стасюк (Салаўёў)—камандант району і Павал Шыманюк, як сэкратар арганізацыі.

У паперах Шыманюка-Скамароха (схаваўшагося няведама куды) знойдзены праграмы „Брацтва беларусаў“, напісаныя самым „бацькай“ саюзу Скамарохам і сакратаром Паўлам Шыманюком і датаваныя 14 студзеня 1922 г.

Сярод дакумэнтаў, перахваченых паліцыяй, надта важным (але, як убачым далей, бадай фіктыўным) зьяўляецца пісьмо, пісанае загаворшчыкам „Тарасам Бульбаю“ да Шыманюка з павіншаваньнем з тым, што ён назначаны акружным атаманам і паведамляе яго, што ўвесь павет гатоў да барацьбы і чакае загадаў, паведамляе, што пасылае да Шыманюка 60 чалавек коннага атраду „дзікай беларускай дывізіі“(!) і што на атрыманыя 18 мільёнаў купіў аружжа на 5000 чалавек(!) і кожнаму з іх заплаціў за 2 месяцы наперад.

У тым жа пісьме „Тарас Бульба“ пішкць да Скамароха пад дыктоўку апошняга, што ён дастаў 18 гр. ц-к (цыяністага калі?) і 2 гр. ст. (стрыхніна?), „так што ўвесь гарнізон Б. (Беласток?) і ўвесь павет ў маіх руках, і дзеля таго ўсюды ёсьць нашыя людзі, дык у першы лепшы дзень можна зьніштожыць усе польскія палкі“. Акт абвінавачаньня прыбаўляець, што мянюшкай „Тарас Бульба“ карыстаўся да гэтых часаў не найдзены Максім Захожы...(?)

У зьвязку з вышэйзложаным раскрыцьцём беларускага загавору акт абвінавачаньня ставіць арышт у першай палове сакавіка 1922 г. у Марцінканцах літоўскага афіцэра Каз. Вайткевіча, які прайшоў граніцу ў поўнай хворме і аддаўся ў рукі польскай уладзе, як уцёкшы з літоўскай арміі з мэтай паступіць на службу польскую. Вайткевіч так вёў сябе, што хутка аб ім вытварылася перакананьне, што ён літоўскі шпіон. Падасланы да яго пасьля арышту агент сыску Тустаноўскі паведаміў, быццам ён ненавідзіць палякоў, а ад разьведкі польскай у Літве былі паведамленьні аб тым, быццам Вайткевіч прасьледаваў палякоў у Літве. Пісьмо да гэтага Вайткевіча знойдзена ў Веры Маслоўскай.

На дапросе Вайткевіч паказаў, што не належыць да беларускай арганізацыі і не зьяўляецца шпіонам літоўскім. Ен быў рэгулярным афіцэрам у Мэрачы, дзе начальнікам штабу IV групы быў Разумовіч-Хмара, па загаду якога Войткевіч некулькі разоў прапускаў вазы з аружжам з Літвы ў Польшчу для беларускай арганізацыі. Дэзэртыраваў Вайткевіч, па яго словах, дзеля таго, што будучы палякам не хацеў служыць Літве варожай да Польшчы.

(Гэты сьведка сваім паказаньнем зрабіў аграмадную ўслугу акту абвінавачаньня: такі падазрэнны па ненавісьці да Польшчы літоўскі афіцэр, як відаць, зусім аб'ектыўна паказываець, што аружжа з Літвы ў Польшчу для патрэб вялікага паўстаньня беларусаў Горадзеншчыны, перавозілі цэлымі вазамі. Трудна толькі верыць паказаньням літоўскага афіцэра-паляка—чалавека, якога як відаць, аднакова з'роўным правам як у Літве так і ў Польшчы падазрываюць у шпіонстве і прыкіданьні. А самае важнае, што гэтага аружжа нідзе ня відаць, ня гледзячы на пастаянныя ссылкі акту абвінавачаньня на цэлыя склады яго).

Калі арганізацыя была выкрыта і шмат асоб арыштавана, застаўшыяся загаворшчыкі баючыся рэпрэсый схаваліся ў Белавежскую пушчу. Тут; згодна з актам абвінавачаньня, наступае круты паварот—зьмена самога характару руху:

З руху вырваны яго ідэйныя элемэнты, як Вера Маслоўская, большасьць застаўшыхся—элемэнты вельмі надазроныя, частка давездена да адчаю правалам справы, рэштка загаворшчыкаў пазбаўлена срэдстваў, і пачынаецца тое, што загаворшчыкі называюць — ваенным тэрмінам — „рэквізыцыямі“, а акт абвінавачаньня—агульным тэрмінам „бандытызмам“.

Распачынаецца шэраг „бандыцкіх нападаў“. Вярнуўшыся з Коўні Шыманюк-Скамарох становіцца галавою „атаманам Горадзеншчыны“, арганізуе з Янкам Грыцюком „баёўку“ у 15—24 чачалавек, якія і робяць шэраг разбойных нападаў:

1. 7 красавіка 1922 г. быў зроблены з мэтай грабежства напад на дом лясьнічага Олькевіча ў ў в. Вітава Бельскага пав.

2. 17 красавіка 1922 г. былі падпалены жалез.-дарож. склады на 102 вярсьце лініі Чэрэмха-Гайнаўка з мэтай па словам абвінавачаных — рэпрэсыі за вываз з краю лесу.

3. 26 красавіка быў зроблены аружны напад на дамы жыхараў в. Белай памоцніка лясьнічага Чыжэўскага, Гелейтэрнаў і Дона з мэтай грабежства.

4. У ноч на 29 красавіка „баёука“ зрабіла напад на м. Кляшчэлі і на мясцовы паліцэйскі пастарунак, пры гэтым былі забіты пастарунковыя Асташэўскі і Божым, утрымацель рэстарана Ануфры Савіцкі і ягоная маці Варвара, а таксама зроблены замах на забойства ксяндза Жылінскага. Частка прыймаўшых удзел у нападзе на пастарунак у Кляшчэлях была 10 траўня 1922 г. злоўлена паліцыяй і па прыгавару даразнага суду сябры групы Скамароха Андрэй Тамашук, Дзем'ян Мартынюк, Янка Захарчук, Янка Нецялюк былі казнены, Васіль Тамашук прыгавараны да безтарміновай катаргі, Панцялею Нічыпаруку кара сьмерці заменена Нач. Дзяржавы безтэрміновай катаргай, апошні памёр у вастрозе.

6 траўня 1922 г. паліцыя выкрыла ў Беластоцкай пушчы патаёмнае местапрабываньне „шайкі“ Скамароха. Ей аднакжа удалося схавацца ад прасьледаваўшых яе паліцэйскіх уладаў. Тут знойдзены чарнавікі пісем і адозваў, розныя заметкі, 6 географіч. картаў Германскага Штабу з паметкамі, 2 банкі з стрыхнінам, рэштки награбленых рэчаў.

З дакумэнтаў знойдзеных у „канцэлярыі“ цікавы „Ультыматум“ Начальніку Дзяржавы Яз. Пілсудскаму з копіяй Лізе нацый ад імя „акружнога атамана беларускіх партызанаў Скамароха“. Ультыматум ставіць гэткія варункі Пілсудскаму пасьля выкрыцьця загавару:

1) Адрачэньне Польшчы ад правоў адносна да Беларусі.

2) Спыненьне рэпрэсый адносна да беларусаў і прызнаньне „нетыкальнасьці ўсяго беларускага“.

3) Найхутчэйшае звальненьне палітычных арыштаваных беларусаў.

4) Найхутчэйшае спыненьне вырубкі і вывазу лясоў у Польшчы.

5) Найхутчэйшая падгатоўка эвакуацыі польскіх войск і уладаў.

6) Астаўленьне ў Белару[illegible]довых установаў і іх маемасьці.

7) Найхутчэйшы созыў меш[illegible] да разрашэньня спорных пытаньняў.

У разе невыпаўненьня вымаг[illegible]ры яго складаюць з сябе адказнасьц[illegible]ыя быць вынікі. „Ня маючы магчымас[illegible] з рэгулярнай арміяй, мы будзем прыменя[illegible]я страшныя срэдствы зьнішчэньня“. Тэрмін [illegible]матума паказаны 9 красавіка.

Там-жа знайдзена чарнавік пісьма Скамароха да шэфа расейскай місіі ў Варшаве Карахана—з прозьбай даць дапамогу Народнаму паўстаньню Беларусі: „Хай Р. С. Ф. С. Р., як старшая сястра дамагаецца ад польскай шляхты прызнаньня нашых законных правоў і дамаганьняў“...

Там-жа знойдзены і рапарт Скамароха Хмары з 27 красавіка 1922г., у якім паведамляецца аб распачацьці актыўнай дзейнасьці, выкліканай абставінамі, аб добрым настроі партызанаў. „Чакаем дапамогі ад Літвы з фронту, абецаючы дакончыць удачы ў тылу“. У канцы дамагаецца піраксыліну, адзкіх машын і г. д.

Там-жа знайдзены і чарнавік тэлеграмы (?) Пілсудскаму, ў якой з прычыны невыпаўненьня ультыматума пагражае пагалоўным зьнішчэньнем палякоў у краі.

Там-жа знойдзены сьпісак асоб, атрымаўшых вялікія сумы за дастаўку правізіі ў „крыювку“ банды ў Белавежскай пушчы.

Вышэйазначаныя пісьмы Пілсудскаму, Лізе Нацый, Карахану і др. пісаў, як сам паказаў у часе сьледзтва, Янка Захарчук (растрэляны па прыгавару даразнага суда) па даручэньню Германа Шыманюка.

Сувязь загаворшчыкаў з Сав. Расеяй паказаў у сваім паказаньні Андрэй Тамашук (таксама растрэляны па прыгавару даразнага суда). Ен паказаў, што Герман Шыманюк быў у Коўні разам з Разумовічам — Хмарай у Савецкім пасольстве і падпісалі там умову аб падтрыманьні Савецкай Расеяй паўстаньня.

Пасьля акт абвінавачаньня падробна пералічывае ўсе ўлікі і весткі, датычачыя кожнага абвінавачанага па асобку.

Аб канкрэтных абвінавачаньнях акту мы будзем гаварыць пры дапросе падсудных і сьведкаў.

Заключэньне акту абвінавачаньня вось якое:

„На падставе вышэйпрыведзеных даных Пракурорскі надзор пры Акружным Судзе ў Беластоку абвінавачывае:

1) Жыхараў в. Агароднікі Дойлідскай гм. Беластоцкага пав. Веру (Валентыну) Маслоўскую, урадж. Матэйчук і др. ужо вядомых чытачом, абвінавачаных у тым, што:

І. Усе яны ў першай палове 1922 г. а) прынялі ўдзел у тайнай арганізацыі (śpisku) меўшай на мэце адарваньне ад Польшчы пры помачы аружнага паўстаньня часткі яе дзяржаўнай тэрыторыі і ўтварэньні з адарванай часткі Незалежнай Беларускай Рэспублікі пры чым загаворшчыкі мелі склады аружжа і ўзрыўчатых матэр'ялаў і б) зрабілі падгатоўку да задуманага аружнага паўстаньня, вэрбуючы беларускую люднасьць у партызанскія атрады, якія павінны былі выступіць проціў Польшчы. Праступленьне гэтае прадугледжана ст. 101 ч. 2 і ст. 102 ч 2 Карн. Кодэксу.

ІІ. Андрэя Рошчанка, Аляксея Нічыпарука, Анісіма Захожага, Уладз. Вайна, А. Назарука, А. Стасюка, С. Мацэевіча. Е. Івашка, Максіма Вольфа і Хведара Крата ў тым, што былі сябрамі аружнай банды Скамароха, састаўленай з мэтай разбоя, пры гэтым Рошчанка быў кур'ерам па справам банды, езьдзіў у Мэрач у Ковенскую Літву—наагул выпаўняў рожныя даручэньня банды па гаспадарчай часьці; Нічыпарук і Захожы былі разьведчыкамі. Ваппа быў разьведчыкам і дастаўшчыком правізіі, Назарук быў кур'ерам банды, Стасюк вёў агітацыю і вербаваў новых сябраў, Крот—кур'ерам і дастаўшчыкам правізіі, Мацэвіч, Іванюк і Вольф прыймалі беспасрэдны уд[illegible] праступленьнях банды. Праступленьне гэтае [illegible]бачана ст. 279 п. 3 Карн. кодэксу.

ІІІ. Яўхіма Іванюка ў аружным нападзе ў складзе банды на дом лесьнічага Олькевіча 7 красавіка 1922 г. і грабежстве (ст. 51, 589 ч. 2 п. п. 4, 5, 6 Кар. Кад. і ст. 15 Przep. Przech. да К. К.)

V. Тых-жа Я. Іванюка ў тым, што ў складзе банды забіў 3 асоб сям'і Олькевіча (ст. 51 і 455 п. 6 К К. і ст. 15 Przep. Przech.)

IV. Тых-жа Іванюка і С. Мацэевіча ў тым, што ў складзе банды падпалілі лясныя склады Віленскае Дырэкціі (ст, 51 і 562 ч. 2 К. К. і ст. 15 Przep. Przech.)

VI, Тых-жа Іванюка і Мацэевіча ў нападзе ў складзе банды на пастарунак паліцыі ў Кляшчэлях, забойстве з мэтай грабежства пастарунковых Я. Асташэўскага і Божыма (ст. 51, 455 п.п. 3, 6, 12 К К. і ст. 15 Przep. Przech.)

VII. Тых-жа Іванюка і Мацэевіча ў нападзе ў складзе банды на дом Мар'янны Божым і аграбленьні яе (ст. 51 і 589 п. п. 4, 5, 6 К.К. і ст. 15 Przep. Przech.)

VIII. Тых-жа Іваяюка і Мацэевіча ў напа[illegible] ў складзе банды на дом рэстаратара Савіцкаг[illegible] Кляшчэлях, грабежстве і забойстве яго (ст. [illegible] 455 К.К. і 15 Przep. Przech.)

IX. Тых-жа Іванюка і Мацэевіча ў напад[illegible] складзе банды на дом Варвары Савіцкай, заб[illegible]стве і аграбленьні яе.

X. Тых-жа Іванюка і Мацэевіча ў напад[illegible] складзе банды на дом кс. Жылінскага і ў зам[illegible] на забойства яго (ст. 49, 51 і 455 К.К. і 15 Prz[illegible] Przech.)

XI. С. Мацэевіча і Нічыпара Вольфа ў ару[illegible]ным нападзе ў складзе банды на дом падлес[illegible]чага Чыжэўскага і аграбленьні яго (ст. 51 і 58[illegible] ll п.п. 4, 5, 6 К. К. і 15 Przep. Przech.)

Пасьля прачытаньня акту абвінавачаньн[illegible] пракурор папраўляе ў ім памылку: пісьмо знай[illegible]дзенае у В. Маслоўскай і адрасованае Вайткевіч[illegible] мае адрасатам не абвінавачанага Вайткевіча, [illegible] другога. Аднак-жа пракурор хадатайству абаро[illegible]цы Вайткевіча—Грушкевіча — з прычыны адп[illegible]дзеньня адзінай улікі аб сувязі Вайткевіча з б[illegible]ларускай арганізацыяй,—замяніць яму меру пр[illegible]сячэньня, звольніць з-пад стражы, спрацівіўся [illegible]

той падставе, што проціў Вайткевіча гэтая уліка не адзіная. Суд адмовіў у хадатайстве абароны.

ДАПРОС АБВІНАВАЧАНЫХ.

Вера Маслоуская (Мурашка).

Першай уводзяць Веру Маслоўскую. Акт абвінавачаньня лічыць Маслоўскую галоўнай арганізатаркай і кіраўнічкай руху на тэрыторыі Горадзеншчыны. Ей ставіцца ў віну: 1) арганізацыя ўсяго тайнага вобчаства, 2) паездка ў Прагу на рэвалюцыйны беларускі зьезд дэлегаткай ад пав. Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага з пашпартам Ураду Ластоўскага і занятую на зьездзе антыпольскую пазыцыю, 3) пастаянная сувязь праз паездкі і перапіску з цэнтральным штабам IV групы ў Мэрачы, 4) атрыманьне вялікіх сум на падтрыманьне руху з штабу Хмары, 5) агітацыя і вэрбаваньне сябраў для арганізацыі самых выдатных, як самога Шыманюка і нават самога... Ленкевіча.

Маслоўская гавора пабеларуску, заяўляе, што мовы польскай ня ведае і Суд запрашае перакладчыка. Пасьля, як пабачым далей, Суд абыходзіўся бадай што без перакладчыка, паслугоўваючыся расейскай мовай.

На пытаньне прадседацеля аб віноўнасьці Маслоўская адказывае доўгаю і гарачаю прамоваю. Прызнаецца, што прыймала самы актыўны ўдзел у арганізацыі, якая ставіць сабе канцовай мэтай утварэньне Незалежнай Беларускай Рэспублікі, але імкнулася да таго, каб злучыць у адно цэлае ўсе часткі разрэзанай Беларусі, ня толькі тыя, што знаходзяцца пад уладай Польшчы, але і тыя, што адыйшлі да Расеі, Латвіі і інш. Выключна проціў Польшчы не змагалася. Прызнаючы ўсё гэтае, ў *гэтым вінаватай* сябе лічыць ня можа. Гэта не праступленьне, а абавязак кожнага патрыота-грамадзяніна перад ягонай Бацькаўшчынай, ці будзе гэта беларус, паляк, ці хто-небудзь іншы.

У тым, што дзеяльнасьць яе асабіста прыняла такі рэвалюцыйны характар, а пасьля дзейасьць прымкнуўшых да арганізацыі людзей выродзілася ў бандытызм, Маслоўская лічыць вінаватаю *польскую ўладу*. Маслоўская падробна і горача, з пераконываючай праўдзівасьцю гаварыць аб тым працэсе, які прывёў яе—скромную работніцу на ніве прасьветы роднага народу—на шлях рэвалюцыйнай барацьбы.

На маладую Польскую Рэспубліку Беларускі Народ ускладаў такія надзеі, так ахвотна і радасна верыла беларуская інтэлігенцыя абяцанкам першых правадыроў Польшчы пасьля яе ўваскрасеньня. Але ўсе гэтыя чаканьні былі ашуканы і ад гэтай веры не засталося бадай нічога. У часе нямецкай акупацыі беларуская нацыянальная школа расла і разьвівалася. З прыходам палякаў адразу стала адчувацца ў гэтай найбалей блізкай для Маслоўскай, дарагой і важнай для беларускага народу галіне, неаб'ясьнімая варожасьць. Палітыка Польшчы імкнулася забіць тут самую душу беларускага народу—яго жывую мову.

У восень 1921 г. Маслоўская паехала на зьезд у Прагу. Былі там і Баранаў і Жабіцкі былі і Аляксюк і Дубяйкоўскі. Зьезд адбыўся пасьля заключэньня Рыскага міру і перадусім меў на мэце выразіць пратэст перад усім сьветам проціў гэтага гібельнага для Беларусі трактату. На зьезьдзе, прызнаецца адкрыта, належала да агромнай большасьці, якая ясна бачыла, што шляхам эволюцыйным беларусы не дабьюцца свайго нацыянальнага ідэала. Пашпарт магла атрымаць толькі ў Коўні, бо адгэтуль ня пускалі нікога, апрача Аляксюка.

Аб сваей дзейнасьці ў Горадзеншчыне гаворыць з поўнай выразнасьцю: запраўды была галоўнай і адзінай арганізатаркай усяго руху. Падпарадкавалася толькі кіраўніцтву галавы ўсей IV групы, такому-ж як і яна сама ідэйнаму беларусу Разумовічу, які паходзіць таксама з Горадзеншчыны, жыўшаму ў Мэрачы ў Літве пры польскай граніцы. Праца нашая была чыстая, ідэйная: ніякага шпіёнства на карысьць Літвы арганізацыя не вяла, ніякіх складаў аружжа у нас ня было, тым болей ня было закідаемай нам труцізны, быццам, каб труціць польскіх афіцэраў і жаўнераў. Не адмаўляюся, што ў далейшым аружжа магло быць патрэбным, нават стаць неабходным, але мы ўсё яшчэ верылі, што Польшча нас зразумее, што ня стане нас ніштожыць, як нацыянальнасьць, што ня трэба будзе брацца за аружжа.

Горача пратэстуе, што іх чыстую сьвятую справу зьвязываюць тут з бандытызмам. „Пакуль я была на чале арганізацыі, ні адна капля крыві не пралілаоя. Усё гэта сталася толькі пасьля таго, як нас арыштавалі і як вынік таго, што заместа нас зьявіліся новыя „кіраўнікі“ руху са сваімі асобнымі „заданьнямі“ . , .

Прадседацель выясьняе, што абвінавачанай ставіцца ў віну толькі праступленьне па ст. ст. 101 і 102 ч. II, а не бандытызм.

На пытаньні Маслоўская адказывае, што ў Літву—ў Мэрач езьдзіла; але дапамогі ад Літвы матэрыяльнай і ваеннай не атрымлівала; на арганізацыю срэдствы даваў беларускі народ; сябраў арганізацыі і памоцнікаў сваіх нэ называе; загады Хмары выпаўняла па меры іх цэлесаабразнасьці.

З паражаючым даверчывым аптымізмам гаворыць аб „ідэйнай“ дзейнасьці—энэргічнай і актыўнай на пачатку—правакатара Ленкевіча Ен працаваў ня толькі бескарысна, але шмат даваў на справу сваіх грошай, пакуль . . . ня выдаў арганізацыі паліцыі.

Лізавэта Шыманюк, жонка „Скамароха“ абрысавана Маслоўскай вельмі ярка. Л. Шыманюк памоцніца мужа да яго арышту, у вастрозе шукала зьбліжэньня з абвінапачанай, старалася выведаць прызнаньня, так што ў Маслоўскай зьявілася пераконаньне, што Л. Шыманюк служыць мэтам паліцыі.

Нарэшце Маслоўская паўтарае, што ініцыаторкай і галавою ўсяе арганізацыі Горадзеншчыны зьяўляецца яна адна. але, прыймаючы пад увагу вышейсказанае, вінаватай сябе прызнаць ня можа.

Пасол Сяргей Баранау.

Акт абвінавачаньня прыводзіць гэткія даныя аб віноўнасьці пасла С. Баранава:

1) Баранаў—«выдатны беларускі дзеяч „kierunku Łastowskiego“».

2) Ен—старшыня мяйсцовай групы сац. рэвалюц. і *нелягалнага* „Беларускага Нацыяналнага Камітэту“.

3) Кіраваў агітацыей і падгатоўкай баевых дружын.

4) Адначасна займаўся шпіонствам.

5) Срэдствы для сябе і на працу атрымліваў з Коўні.

6) У часе прыходу бальшавікоў быў старшынёю „юрыдычнага аддзелу“ Рэвалюцыйнага Трыбуналу ў Горадні.

7) З бальшавікамі падтрымлівае зносіны і дагэтуль і, бадай, атрымлівае ад іх грошы на рэвалюцыйную працу—ў абмен на шпіонства.

Вось якія данныя Ярэцкага кап. Д. О. К. III у Горадні, абаснованых на даных выведоўцаў, без далейшага паказаньня крыніц.

Рабіўшы дазнаньне аб беларускім руху кіраўніка III рэфэрату экспазытуры 5f. Людвік Сяюсарчык дае гэтакі одзыў аб Барававе: „вядомы ў Горадзеншчыне беларускі дзеяч; прыймае дзейны ўдзел у арганізацыі: прыхільнік беларускага рэвалюцыйнага руху проціў Польшчы; быў у змове з урадам Ластоўскага: быў *празначаны*(!?)*ваеводай*(?) Горадзенскім... у выпадку, калі Бэларусь будзе незалежнай..., падтрымліваў пастаянную сувязь з Маслоўскай, Аўгеняй Матэйчук, Парукам і інш., на зьездзе ў Празе падпісаў вядомую антыпольскую дэкларацыю.

У часе вобыску знайдзена:

1) Сакрэтная інструкцыя жандармэрыі. Горадня. 1920 г.“

2) Пашпарт выдадзены ў Коўні 20 X 1921 г. Урадам Беларускай Народнай Рэспублікі з указаньнем беларускай дзяржаўнай прыналежнасьці Баранава.

Паказаньне пасла Баранава.

Вінаватым сабе не прызнае. Да гэтай справы прыцягнуты без усялякай падставы. На суд зьявіўся дабравольна. Абвіняемы быў арыштаваны ў 1922 г. і дапрашываўся дэфэнзывай у зьвязку з раскрытаю беларускаю арганізацыяй. Сабраньне, якое ставяць мне ў віну, мела на мэце арганізацыю дабрачыннага таварыства—дапамогі ахвярам вайны. Аб паўстанчай арганізацыі нічога ня знаў, дзеля таго, што сувязі з ёй ня меў. З Маслоўскай ня меў нічога супольнага і ў Коўні ня быў. Быў старшынёю *легальнага* Беларускага Нацыянальнага Камітэту, адкрытага з дазволу польскай улады, які перастаў істнаваць у 1921 годзе. Ні ў якіх палітычных баявых арганізацыях удзелу ня прыймаў, працаваў па каапэрацыі і ў дабрачынных і культурна-прасьветных арганізацыях. У часе бальшавіцкай акупацыі служыў у юрыдычным аддзеле. „Што я быў назначаны ваеводай Горадзеншчыны мне нічога няведама“. Маслоўскую і Матэйчук знаў, калі былі вучыцелькамі ў Горадні.

На зьездзе ў Празе быў; ніякіх дэкларацый не падпісываў, а ўсе рэзалюцыі прынятыя на зьездзе былі апублікованы ў газэтах. У зьездзе прыймаў удзел пэрсанальна, а не як дэлегат, лічучы патрэбным як грамадзкаму дзеячу быць прысутным на падобных зьездах, на якіх абгаварываецца пытаньня датычачыя беларускага народу. На зьезьдзе аб якім аружным паўстаньні нічога ня гаварылася, абгаварывалася сытуацыя, стварыўшаяся дзякуючы Рыскаму трактату. Загранічны пашпарт выданы консулам Бел. Народн. Рэспублікі з наметкай „Коўня“ ў Празе. Пашпарт гэты не дыплёматычны, а звычайны пашпарт аналёгічны з выдаваўшыміся Дубяйкоўскім у Варшаве. Пашпарт знойдзены ня ў мяне, я яго згубіў даўно. Ніякіх інструкцый у мяне ня знойдзена. У пратаколе вобыска ні слова аб інструкцыі няма.

Ніколі не адмаўляўся ад таго, што я беларускі дзеяч. Працу вяду шмат гадоў і, калі за беларускую справу прышлося сесьці на лаўку падсудных, дык гэта мяне не агарчае, бо я сябе ахвяраваў на барацьбу за лепшую будучыну беларускага народу. Вёў гэтае змаганьне і вяду яго цяпер будучы паслом у Сойме.

Пасол Сямен Якавюк.

Даныя акту абвінавачаньня.

1. Па паказаньнях Ленкевіча адзін з галоўных дзеячоў беларускай арганізацыі, езьдзіў у Коўню. Атрымаў там ад Літоўскага ўраду 70,000 мар., на што купіў дамы (у 1922 г.)

2. (Паказаньні кап Яроцкага нач. II адз. Ген. Шт. у Горадні). Якавюк заслужывае асаблівай увагі, дзякуючы бліскай сувязі яго з людзьмі падазрэннымі ў шпіонскай дзейнасьцяй у карысьць Літвы“ (дaслоўна!)

3. (Паказ. Агента Мазуркевіча). Ад упраўляючага домам Якавюка знаець, што пастаянна бывалі тайныя сабраньні, на якіх нікога не дапускалі; бываў пас. Баранаў.

4. У Вас. Кажанава, які падазраваўся ў вучасьці ў паўстаньні, знойдзен сьпісак, дзе фігуруець і Якавюк, дзе супроць яго прозвішча зроблена надпісь: „рэв. ком.“ (разумецца—„рэвком“, а не рэвізыйная камісія!! Увага карэспандэнта).

5. Быў сябрам Нацыянальнага Беларускага К-ту ў Горадні.

І гэта ўвесь матэр'ял, якім карыстаўся пракурор, і на аснове гэтых даных патрэбаваў у сваей прамове для пас. Якавюка ... бестэрміновай катаргі!

Паказаньні абвінавачанага С. Якавюка. Абвін. С. Якавюк не прызнаець сябе віноўным. Ніякіх грошы з Коўні не атрымліваў і ў Коўню ня езьдзіў. Дом купіў у 1919 г. у сакавіку м. за 1500 руск. руб., на што прадставіў купчую. Быў віцэ-старшыня першага Белар. Нац. К-ту ў Горадні. К-т карыстаўся матэр'яльным і маральным падтрыманьнем ад польскай улады, за што пры бальшавіках быў арыштованы і пасаджаны ў вастрог. Якавюк прасядзеў у вастрозе каля месяца, а пасьля быў вывезены бальшавікамі ў Расею, але на дарозе ўцёк і тры дні хаваўся ў Барысаглебскім манастыры. Нагаварыўшы на С. Якавюка Станіслаў Пузырэўскі (каталік—паляк па польскаму пашпарту) у сапраўднасьці-жа—па расейскаму пашпарту—Пузыров Сяргей.

Пракурор прадставіў суду два дакуманты: 1) Акт абвінавачаньня і 2) Прыгавар ваен. суда, па якому Пузырэўскі быў засуджаны на шэсьць гадоў катаржных работ.

У гэтых актах ёсьць ссылка на тое, што быццам Якавюк казаў неякам чалавеку аб тым, што Пузырэўскі выехаў у Літву і што ён польскі шпіон і быццам перашкаджае Якавюку ў яго рабоце. Якавюк заявіў, што да часу пакуль Пузырэўскі ў яго не жыў—яго зусім ня знаў і ня чуў, каб ён езьдзіў у Літву.

Прачытаўшы ў „Gaz. Warsz.“ пісьмо Пузырэўскага, ў якім ён абвінавачывае Якавюка у яго арэшце ў Коўні, Якавюк неадкладна прыняў меры пацягнуць Пузырэўскага да адпаведнасьці, але да гэтага часу ня можа яго найсьці,

У апошнім сваім слове Якавюк заявіў, што сам пшэдоўнік Гродненскай паліцыі казаў яму, што Пузырэўскі выехаў у Расею. На суд-жа гэты сьведка не зьявіўся. Па заяўленьні самога Пракурора суд над Пузырэўскім у Коўні кончыўся апраўданьнем яго.

Цікавыя даныя падаў кс. Гэрмановіч Беларускаму Пасольскаму Клюбу, з якіх відаць, што Пузырэўскі быў бальшавіцкім камісарам і на яго сумленьні ляжыць больш ста ахвяр, што гэты. Пузырэўскі пад угрозай браўнінга патрэбаваў ад кс. Гэрмановіча выдачы яму мэтрыкі, што ён каталік і паляк. Як падцьвярджэньне ўсяго сказанага кс. Гэрмановіч просіць вызваць сведак докт. Белецкага і Марозова.

(Працяг будзе)

Суд і вуліца.

Суд над групай беларусаў, што адбываецца цяпер у Беластоку, у руках польскага нацыяналізму абярнуўся ў спосаб дзеля нацкаваньня шырокіх масаў польскага народу на народ беларускі.

Кожын дзень эндэцкія газэты друкуюць вялізарныя судавыя „справаздачы", ў каторых блізу нічога няма аб тым, што робіцца на судзе, што паказуюць сьведкі і т. п., а за тое ёсьць самая подлая брахня на беларусаў, ёсьць выліваньне брудных памыяў на кожнага справядлівага чалавека, які на судзе асьмеліваецца казаць *праўду*. Найбольш ярка выступае ў гэтым кірунку варшаўская газэта „Gazeta Poranna". Карэспандэнт яе, Гзоўскі, найміт, што прадаўся за грошы і некалі працаваў у Менску ў бальшавіцкай газэце, а цяпер прадаўся эндэкам, у сваіх карэспандэнцыях апавядае аб усім чым, толькі не аб судзе. І гэта зразумела: якія-б ні былі адносіны судзьдзяў да беларускага народу, яны не павінны забывацца, што яны-ткі перш за ўсё судзьдзі,—вось, поруч з рознымі брахлівымі заявамі правакатараў, на судзе выяўляецца патроху і запраўдны абраз таго, што зроблена падсуднымі. А ў гэтым абразе *нічога ганебнага для народу беларускага няма!*

Ясна, што суд, калі будзе судзіць бесстаронна павінен выявіць ўсяму польскаму народу брахлівасьць нацыяналістычнае прэсы. Вось-жа газэтны паход эндэкаў проці беларусаў, вулічныя выкрыкі Обстаў і Гзоўскіх аб „беларуска-літоўска-бальшавіцкай змове проці Польшчы", паўтараныя кожын дзень, і маюць на мэце зрабіць такі ўплыў на беластоцкі суд, каб той ня мог судзіць запраўды бесстаронна. Судзьдзі—ўсё-ж такі астаюцца людзьмі. І калі ў часе падгатоўкі і разгляду справы нейкія правакатары вызываюць масавыя арышты сярод беларусаў, вінаваченых у арганізацыі паўстаньня ня толькі ў Горадзеншчыне, але і на ўсходнім рубяжы (у Дзісеншчыне, Вялейшчыне і т. д.), калі „Dziennik Wileński" пускае правакатарскія чуткі аб пастанове беларускага пасольскага клюбу зрабіць паўстаньне, калі піша подлую брахню, быццам Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт служыць не беларускаму народу, а прадаецца бальшавіком,—дык у галовах беластоцкіх судзьдзяў родзіцца думка: „а мо' ткі гэта ўсё праўда? а мо' дзеля збаўленьня „ojczyzny" і варта пакрывіць душой і засудзіць усіх падсудных? Гэта нічога, што брахлівыя пісакі за сваё лганьня сядуць пасьля ў вастрог: калі прыгавар у беластоцкім судзе вынесены па іх думцы, калі праліецца бязьвінная кроў некалькіх беларусаў, мо' і выбраўшых абмылковую дарогу ў сваім імкненьні служыць Бацькаўшчыне, дык нягодная работа Обстаў—Гзоўскіх будзе зроблена. Гэтыя чалавеканенавісьнікі, бяздушныя людзі ў імя сваіх праступных мэт гатовы на ўсё.

„Вуліца" з сваімі пісакамі яўна ўрываецца ў залю беластоцкага суда. Ці хопіць у судзьдзяў павагі і самастойнасьці пры вырашэньні справы ня толькі 45 падсудных, але справы захаваньня *справядлівых* адносін польскага народу да народу беларускага? вось пытаньне, адказ на якое павінен даць судовы прыгавар. І ўсе беларусы будуць з нецярплівасьцю ждаць гэтага прыгавору, бо ён павінен паказаць, ці для нашага народу пад уладай Польшчы ёсьць праўда і справядлівасьць.

Лаўрыновіч

З АРХІЎНЫХ МАТЭРЫЯЛОЎ.

Эндэцкія газэты, каб абаламуціць польскае грамадзянства, стараюцца з беластоцкім працэсам зьвязаць тыя беларускія вайсковыя фармаваньні, якія рабіліся ў Менску ў 1919-20 гадох.

Як усім ведама, гэныя вайсковыя фармаваньні ня робяць гонару беларусам, бо рабіліся яны *паводле дэкрэту б. Начальніка Гаспадарства, пана Язэпа Пілсудскага,* выданага ў кастрычніку 1919 году. Але беларусам ведама яшчэ і нешта другое: гэта — тое, што той-жа пан Пілсудскі, падпісаўшы дэкрэт, даў сваім служкам загад (ведама, „poufny") каб дэкрэту . . . не спаўнялі!

Нам давялося атрымаць цікавы дакумэнт, які выкрывае падвойную ігру пана Пілсудскага ў адносінах да беларусаў і павінен „абяліць" яго ў вачах эндэкаў. Гэта — патайны прыказ улады, каб не дазваляла вясьці сярод народу агітацыі на карысьць гэных беларускіх вайскавых фармаваньняў. Даем тут гэты прыказ так, як ён быў напісаны:

Zarząd Ziem. Wschdnich.

OKRĘG MINSKI.

Wydział Narodowosciowo-Wyznaniowy

dnia 27/IV. 1920 r.

№ 1524/8038.

Odpis z odpisu

Ściśle poufne.

Do Pana Starosty pow

Ihumeńskiego.

Z roskazu Naczelnika Okręgu komunikuję, , że w powiatach coraz więcej kursuje działaczów białoruskich, emisarjuszy różnych białoruskich, organizacji oświatowych, ekonomicznych i t. p. Należy bacznie śledzić, aby ci agenci, o ile posiadają pozwolenia, ściśle się trzymali w swej działalności zadań, przewidzianych w tych pozwolenich. Bezwzględnie trzeba ukrócać wszelkie próby propagandy nie narodowościowo-kulturalne, ale polityczno-państwowe. Zwłaszcza trzeba śledzić, aby ci agenci nie prowadzili agitacji werbunkowej do formacji białoruskich, gdyż to należy wyłącznie do Inspektoratu Werbunkowego Zarządu Cywilnego.

(—) I. E. Fostowicz-Zahorski.
Inspektor Polityczny.
Za zgodność (—) Baniewicz.
p. o. Szefa Kancelarji.
Za zgodność (—) A. Osipowicz.
Za naczelnika rejonu № 6.

Pieczęć
Naczelnika rejonu VI
Ihumenskiego powiatu.

Заграчнічная прэса аб Беластоцкім працэсе.

Чыкагская газэта „Свободная Россия" дае падробныя цыфровыя данныя аб меўшым быць беларускім паўстаньні ў Польшчы, аб трудным становішчы беларусаў у Польшчы, выказываючы пры гэтым спагаду арыштаваным і веру зьдзейсьненьне ідэі беларускага народу.

Нямецкая газэта. „Дайчышэ Ояг. Цайтунг" паведамляе аб вялікіх ваенных прыгатаўленьнях Польшчы на ўсходніх крэсах—усё гэта быццам у зьвязку з Беластоцкім працэсам які вызваў вялікі рух сярод беларусаў.

„Журналь де Полонь" шмат піша аб Беластоцкім працэсе.

Па славах гэтай газэта ведаць, што паўстаньне мелася пачацца ў двух мясцах. Адно недалёка савецкай Беларусі, каля Стоўпцаў і Барановіч, а другое у Горадзеншчыне.

С. С. С. Р.

Прыгатаўленьне да спатканьня польскіх взгнаньнікаў у Расею.

На працягу ўсей беларускай граніцы, савецкая ўлада робіць прыгатаўленьні да спатканьня згнаньнікаў, якія чакаюцца з Польшчы. У пагранічных гарадах арганізуюцца пункты кармёжкі, на якіх ляжаць абавязкі надзеляць згнаннікаў вопраткамі і харчамі пасьля чаго іх будуць адпраўляць на бацькаўшчыну.

(„Данц. Вестнік").

Беларускі вечар у Маскве.

У суботу 14-га красавіка ў памяшканьні студэнцкае сталоўкі ў Пятроўскай Сельска Гаспадарчай Акадэміі адбыўся *беларускі вечар спэктакль,* уладжаны драматычнай сэкцыяй Беларускае Культурна-Навуковае Асоцыяцыі.

Праграма вечару такая: гр. Лойка падзяліўся сваімі цікавымі і багатымі зьместам уражэньнямі аб зарубежнай Беларусі, пастаўлена бытавая беларуская камэдыя з шляхоцкага жыцьця *„Міхалка"* пад рэжысэрствам студэнта І. Тышкевіча, была дэклямацыя і мастацкае чытаньне, выступаў беларускі студэнцкі хор пад кіраўніцтвам студ. Я. Грабоўскага, прадэманстраваны беларускія скокі — лявоніха. Большасьць удзельнікаў вечару—студэнты-пятроўцы і студэнты-беларусы другіх навуковых устаноў, зацікаўленыя беларускім пытаньнем.

Гэтым, маючы вялікі посьпех сярод як беларускага, так і небеларускага студэнцтва, вечарам не абмежоўваецца культурная праца студэнтаў-беларусаў пятроўцаў.

У хуткім часе Харавая Савецкая Беларускае Студэнцкае Асоцыяцыя Пятроўскай Акадэміі разам з харыстамі Беларускай студыі ў Маскве пры удзеле вядомай артысткі-сьпевачкі народных песень Ірмы Яунзэм думае наладзіць вялікі беларускі канцэрт. Спачатку ў Вялікай Аўдыторыі ў Пятроўцы, а пасьля ў Калённай Залі Дома Саюзаў у Маскве. Мяркуецца вялікая праграма канцэрту, зложаная з лепшых беларускіх народных і рэвалюцыйных песень у вакананьні хора, потым дуэты з п'есы М. Кудзелькі „На Купальле", сольныя нумары, трыо, квартэт і інш. Мажліва, што да ўдзелу ў беларускім канцэрце ўдасца прыцягнуць каго з вядомейшых маскоўскіх артыстаў - беларусаў, якіх тут ёсьць шмат.

П. Красачка.

Беларусы у Петраградзе.

Раней у Петраградзе была толькі асацыяцыя студэнтаў-беларусаў пры Сельска Гаспадарчым Інстытуце. Але цяпер арганізавалася асацыяцыя студэнтаў-беларусаў усіх ВУЗ Петраграду. Ассацыяцыя, хаця і вельмі мала, але працуе. Вяласьць працы тлумачыцца тым, што вясна—самая гарачая пара для студэнтаў у сэнсе падрыхтоўкі залікаў. Але ня гледзячы на гэта, многія таварышы рыхтуюць даклады. Трэба адзначыць вялікі ўдзел у працы асацыяцыі праф. Канчара, пад кіраўніцтвам якога распрацоўваюцца даклады. Рыхтуецца беларускі спектакль і г. д. Наогул, трэба думаць, што беларуская культурная праца ў Петраградзе не заглохне, а прыме больш інтэнсыўны характар.

Нядаўна ў клюбе Інстытуту адбыўся сход студэнтаў-беларусаў усіх ВУЗ г. Петраграду. На сходзе прысутнічалі т. Жылуновіч і беларускі эканаміст Канчар, якія пасьля сходу зрабілі даклады.

З Вільні.

У Віленскай Беларускай Гімназіі.

Не так даўна вярнуўся з Варшаве Дырэктар Віленскае Беларускае Гімназіі п. А Трэпка, куды ён ездзіў па справах фінансовае дапамогі гімназіі і экзаменаў на матуру.

Віцэ Міністар прасьветы, які прымаў яго, абяцаўся даць грашавую дапамогу. Што датычыць правоў для вучняў, то Віцэ-міністр заявіў, што сёлета яшчэ разлічаць на гэта нельга, дзела таго, што міністэрства яшчэ не мае дакладнага прадстаўленьне аб пэдагогічным становішчы гімназіі, але гэтае пытаньне зусім не выключана для наступнага школьнага году.

Педагагічная Рада Гімназіі, канстытуючы той факт, што вучні 8-ае клясы досьць добра падгатаваны з усіх прадметаў вырашыла зрабіць сёлета выпускныя экзамены у 8 кл. па ўсіх тых навуках, па якіх вымагаецца экзамен на матуру па рэгуляміну, выдадзенаму куратарам Віленскага Школьнага Вокругу.

Заняткі ў гімназіі скончацца 20 чэрвеня.

Да волі, роўнасьці і знаньня
Мы працярэбім сабе сьлед.
І будзе ўнукам панаваньне
Там, дзе сягоньня плача дзед.

Я. КУПАЛА.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу.

1) **Вільня**, Віленская вул. 12 кв, 6.
2) **Ліда**, II Слабодка 8, сэкрэтар Калясінскі.
3) **м. Глыбокае**, Дзісьненскага павету, вул. Сенкевіча 46.
4) **Жодзішкі**, Сьвянцянскага пав. кс. Годлеўскі.
5) **Навагрудак**, Вялікі Рынак 14, сэкр. Ян. Біруковіч.
6) **Нясьвіж**, Альбянская 28, сэкр. Ян Шнаркевіч.
7) **Столбцы**. Шпітальная 22, Г. Сабалеўскі.
8) **Баранавічы**
9) **Горадня**, Мастовая 9.
10) **Залкавыск**, Пясковая 14.
11) **Бельск**, Замковая вул. 3, кв. 1 сэкр. Канстанты Карыцкі.
12) **м. Саколка**, Горадзенскаявул. 34.
13) **м. Клешчэлі**, Бельск. павету.
14) **м. Крынкі**, Горадзенскага павету, Горадзенская вул. 34.
15) **Пружаны**. Вул. кс. Буткевіча, 16

Беларускае Грамадзянскае Сабраньне

з прычыны заканчэньня конкурсу, прапануе аўтарам, даваўшым на конкурс пьесы, забраць іх, а аўтарам: **„П. С. Х.", „Жыцьце і каханьне"** і **„Янка Канцавы"**, апрача таго і **прэміі**.

Рэдактар-выдавец У. ГРОНІМАЎ. (Стэфанаўская, 15).

Друкарня Дворжэца, Завальная 32.